УДК 82.09 (476)

# ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ В. БЫКАВА
## (На прыкладзе апавядання «Сцяна»)

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Артыкул закранае спектр асноўных праблем, што цікавяць філасофію экзістэнцыялізму: абсурд, адзінота, бунт, самасць, час і прастора, фінал. Разглядае пункт погляду вядучых філосафаў-экзістэнцыялістаў канца XIX - першай паловы XX стагоддзяў на абазначанае кола пытанняў. Твор В. Быкава «Сцяна» аналізуецца ў святле экзістэнцыяльнага філасофскага напрамку.*

Экзістэнцыялізм - філасофская канцэпцыя, у цэнтры якой знаходзяцца праблемы жыцця (чалавечага існавання - свабоды, адзіноты, дысгармоніі, абсурднасці), смерці і, нарэшце, бессмяротнасці. Традыцыйна прынята лічыць, што літаратура экзістэнцыялізму ўзнікла І развівалася ў канцы XIX - першай палове XX стагоддзяў у працах Ж.-П. Сартра, А. Камю, Г. Марсэля, М. Мерла-Понці, М. Хайдэгера, К. Ясперса, М. Бубера, Х. Артэгі-і-Гасета, М. Бярдзяева, Л. Шэстава і інш.

Тэрмін «экзістэнцыя» разглядаецца, адпаведна, усімі прадстаўнікамі дадзенага філасофскага напрамку і разумеецца імі па-рознаму.

Для М. Хайдэгера, напрыклад, сапраўднае быццё - гэта ўсведамленне сваей канчатковасці, гістарычнасці, смяротнасцІ. Экзістэнцыя, такім чынам, накіраваная да смерці, а чалавек асуджаны на адзіноту. Экзістэнцыяльнасць з'яўляецца адрозненнем чалавечага быцця ад таго, што ўжо ёсць, - відавочна, магчымы праект з будучыні на сучаснасць.

Г. Марсэль жа разглядаў экзістэнцыю як антыпод аб'ектыўнасці - такім чынам, для яго характэрны «хрысціянскі сакратызм».

Ж.-П. Сартр сцвярджаў, што існаванне папярэднічае сутнасці. Катэгарычны імператыў Ж.-П. Сартра: карыстайся сваей свабодай, каб быць самім сабой.

У творчасці А. Камю выразна прасочваюцца два этапы: тэма абсурду, тэма бунту. Пачуццё абсурднасці нечакана нараджаецца з нуды - індывід выпадае з паўсядзённага жыцця, пачынае асэнсоўвапь тое, што адбываецца. Жыць, паводле А. Камю, - гэта ўменне жыць абсурдна. Чалавек павінен бачыць, што няма ніякай надзеі на «прыгожае заўтра», што трэба жыць тут і зараз. У гэтым праяўляецца своеасаблівы выклік абсурду. 3 абсурду вынікаюць наступныя следствы: бунт, свабода і страсць.

Х. Артэга-і-Гасет сцвярджае, што чалавек не можа быць абсалютна свабодным, але ён шукае шляхі для сваёй свабоды, з'яўляючыся істотай, якая асуджаная перавесці неабходнасць у свабоду.

Для І. Канта фундаментальныя праблемы - Бог, свабода і бессмяротнасць душы - з'яўляюцца звернутай формулай сэнсу чалавечага жыцця.

Экзістэнцыя ж для К. Ясперса - неаб'ектывіруемая чалавечая самасць, а значыць, яна не можа быць пазнаная. Яе не можа быць без барацьбы і пакут, без пачуцця віны і смерці-расплаты. Неспасцігальнай мяжой усялякага быцця ці мыслення з'яўляецца трансцэндэнцыя; яе філосаф прыраўноўвае да Бога, крытэрыем сустрэчы з якім выступае момант «анямення», нявыражанасці ў слове. Такім чынам, фундаментальныя праблемы І. Канта ў творчасці К. Ясперса трансфармуюцца ў праблемы трансцэндэнцыі, свабоды і экзістэнцыі.

Здавалася б, трансцэндэнцыя можа забяспечыць пачатковую ўстойлівасць чалавечай экзістэнцыі. Аднак К. Ясперс не назірае гармоніі ў экзістэнцыі. Наадварот, ён абвастрае праблему супярэчлівасці экзістэнцыяльнай цэласнасцІ. 3 усяго жывога, паводле К. Ясперса, толькі адзін чалавек ведае пра сваю канчатковасць, у самім чалавеку заключана прыгнечанасць, з якой вырастае для яго задача і магчымасць. Ён выяўляе, што знаходзіцца ў роспачным становішчы, але так, што пры гэтым яму прад'яўляецца настойлівае патрабаванне - узвысіцца шляхам свабоды. У чалавеку, такім чынам, можна бачыць і самую нікчэмную, і самую высокую істоту.

У чым жа К. Ясперс бачыць прычыну прыгнечанасці і роспачнага становішча чалавека?

Увогуле, жыццё ў экзістэнцыялізме разумеецца як каштоўнасць у яе сацыялізаванай праяве, а выпаданне чалавека з сістэмы сацыяльных сувязей пазбаўляе жыццё ўсялякага сэнсу, і яно перастае быць каштоўнасцю. Тыповы прыклад такога пазбаўлення каштоўнасці - поўная ізаляцыя чалавека ад грамадства або сітуацыя, калі ён трапляе ў абсалютна чужое для яго асяроддзе, што таксама з'яўляецца поўнай ізаляцыяй чалавека ад «свайго» грамадства. У гэтым выпадку экзістэнцыя або проста згасае і змяняецца

пачуццём адзіноты, дысгармоніі, апатыі, або актывізуецца і перарастае ў страсць мэтанакіраванай дзейнасі - магчымасць вырвацца з гэтага кола жыцця, з гэтай «замкнёнай» прасторы.

Такім чынам, у грамадстве *ў* чалавека не абавязкова ўзнікае страх смерці пры разуменні ім сваей рэалізананасці, якая можа быць увасобленая *ў* доўгай мернасці жыцця, а можа спрэсавацца і ў адным учынку. Тут, аднак, ёсць пачуцці, але няма экзістэнцыі. Яе галоўны момант - несупадзенне ўнутранага і знешняга быцця чалавека, неадэкватнае ўспрыняцце яго ўчынкаў, неразуменне яго думак, нятоеснасць дадзенасці свету яму і іншым людзям аж да пачуццёвага ўспрыняцця. Пры наяўнасці кантакта не назіраецца сувязей, ёсць зносіны, але няма разумення. Відавочна, экзістэнцыя - гэта сацыяльнае быццё чалавека са скажонай адваротнай сувяззю, гэта драма незразумелай ісціны індывіда.

Значыць, «несапраўднае» быццё чалавека прадуцыруецца ў шэрагу выпадкаў адносінамі з іншымі людзьмі. Менавіта яны ствараюць напружанасць экзістэнцыі, абумоўліваюць патрэбу ў свабодзе як адзіным спосабе вырвацца з палону канчатковасці.

Такімі адносінамі, што нараджаюць чалавечую экзістэнцыю, вельмі часта з’яўляюцца адносіны няроўнасці, бо пры роўнасці экзістэнцыя проста не ўзнікае. І безвыходнасць становішча чалавека праяўляецца ў тым, што гэтыя адносіны няроўнасці нельга пераадолець, а значыць, немагчыма вырвацца з канчатковасці (і, па сутнасці, нікчэмнасці) быцця.

Такім чынам, сутнасць экзістэнцыі заключаецца ў памкненні выразіць рэальнае быццё праз сімвалы каштоўнаснай свядомасці і знайсці рацыянальнае рашэнне каштоўнасна выражаных рэальных праблем.

Экзістэнцыя знайшла сваё ўвасабленне ў творах рускай (М. Лермантаў, Л. Талстой, М. Булгакаў, Ф. Дастаеўскі і інш.) літаратуры. Для беларускай літаратуры не характэрны шматлікія экзістэнцыяльныя матывы, праўда, варта прыгадаць асобныя творы *Я.* Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Караткевіча.

Яскравым прыкладам выкарыстання экзістэнцыяльных матываў для нашай літаратуры з’яўляецца творчасць Васіля Быкава. Пераважная большасць твораў аўтара прысвечана ваеннай тэматыцы, а сама арэна ваенных дзеянняў для пісьменніка - гэта агульначалавечая і асабістачалавечая трагедыя.

На вайне пануюць роспач, боль, жах і, часам, нават абсурднасць. Значна складаней спасцігнуць учынкі людзей і надаць чалавечаму жыццю сэнс. Наш няпросты, бязмэтны і бескаштоўнасны час утрымлівае ў сабе вялікую для чалавека трагедыю - людскую абыякавасць. Гэтую і многія іншыя праблемы закранае аўтар у творы «Сцяна» (1995), жанр якога можна вызначыць як прыпавесць (што характэрна для творчасці В. Быкава апошніх гадоў). Відавочная паралель з Ж.-П. Сартрам і яго навэлай, якая мае аналагічную назву.

Васіль Быкаў у сваёй творчасці імкнецца спасцігнуць жыццё і напоўніць яго асабістай гуманістычнай філасофіяй. Чалавеку ўласціва баяцца абсурднасці існавання, загадкавасці Быцця і яго завяршэння - смерці. Чалавек у гэтым свеце - адзінокі госць, бездапаможны перад тварам няўмольнага лёсу.

Пісьменнік у дадзеным творы з псіхалагічнай дакладнасцю паказвае ўнутраны стан героя - вязня, асуджанага па палітычных матывах. Спачатку герой знаходзіцца ў стане пасіўнасці - ён успамінае пра былое: каханую, людзей і падзеі, што прывялI яго ў гэтую каменную турму. Ён як бы пераасэнсоўвае свае мінулае жыццё.

Дадзены твор вельмі сімвалічны. Герой не мае ўласнага Імені; краіна, ў якой ён жыве, таксама безыменная. Відавочная аўтарская праекцыя «мінулае-сучаснасць-будучае», варта прыгадаць аповесць «Аблава», галоўны персанаж якой таксама, як і наш безыменны герой, трапіў пад жорсткую дыктатуру і быў знішчаны дзяржаўнай машынай. Чалавек-«винтик» знікае ў небыцці пад уплывам рэчаіснасці, якая па сваёй сутнасці з’яўляецца абсурднай. Гэтая сітуацыя - пазачасавая і вельмі трагічная.

Адзінае, што трымае чалавека ў гэтай абсурднасці, - надзея, нейкі прыдуманы ім самім сэнс. У дадзеным выпадку - гэта каменная камлыга, шляхам якой чалавек імкнецца, як яму здаецца, здабыць сабе свабоду. І ён бязмэтна і асуджана точыць камень - так, як Сізіф ускатвае той жа камень на гару. І няма пакарання горшага за бессэнсоўную працу, бо нельга нічога змяніць у гэтым абсурдным свеце. «Боги не без оснований полагали, что нет кары ужаснее, чем нескончаемая работа без пользы» [1].

Чалавеку ўласціва думаць, што ёсць нешта, здольнае выратаваць яго ў хвіліну небяспекі. «Галоўнае - вырвацца на волю... Напэўна, для вельмі вялікай, высакароднай мэты ўсе сродкі добрыя...» [2]. У сувязі з гэтым варта прыгадаць савецкую краіну і савецкую рэчаіснасць (вялікі абсурд), дзе для дасягнення канчатковай мэты былі «все средства хороши». З другога боку (паводле Артэгі-і-Гасэта), несвабодны абсалютна чалавек шукае шляхі і пераводзіць неабходнасць у свабоду.

Традыцыйны ўцек - таксама абсурдны па сваёй сутнасці. Пасля тыповай ізаляцыі адбываецца заканамерны ўсплеск экзістэнцыі - імкненне пераадолець Час, Быццё, Вечнасць, даказаць каханай і людзям, што ён не вінаваты, што яго дарэмна асудзілі. Але ёсць Нехта ці Нешта, ці проста абставіны, ці рок,

што часам кіруе людскімі лёсамі. І ёсць другі бок медаля - натоўп (грамадства), здольны адыграць такую ж самую фатальную ролю ў жыцці чалавека.

СІмвал сцяны - класічны, экзістэнцыяльны, ён з’яўляецца базавым, пачынаючы з назвы і заканчваючы апошнімі радкамі. Сцяна - гэта фізічная перашкода, якая аддзяляе героя ад знешняга свету, ад волі; псіхалагічны бар’ер у чалавечай свядомасці І бар’ер паміж чалавекам і грамадствам. Там, за сцяной, знаходзіцца нешта невядомае, незразумелае, таямнічае, а значыць, - жаданае. «Звычайна па той бок была ...недасяжная для яго воля... А можа, засцяной не было нікога» [2],

Васіль Быкаў знарок не абазначае катэгорыю таго, што знаходзіцца за сцяной. Гэтая катэгорыя з’яўляецца неспасцігальнай для свядомасці простага чалавека. Чалавек - гэта адзІнокая пяшчынка ў акіяне Сусвету. Ён замыкаецца ў сваім «кутку», адасабляючыся ад вонкавага свету, і бачыць у гэтым звужэнні прасторы сваё выратаванне. І непазбежна наступнае: чалавек не можа разбурыць ці пераадолець нябачную сцяну, бо да канца не здольны спасцігнуць законы Сусвету І процістаяць ім. Чытаючы Васіля Быкава, варта ўлічваць такую катэгорыю, як прастора і час - хранатоп, без чаго творчасць аўтара нельга поўнасцю зразумець.

Герой успамінае і аналізуе мінулае (але гэта справа бессэнсоўная І няўдзячная), думае пра будучае (але для чалавека яно недасяжнае і неспасцігальнае). Ён існуе тут і зараз (несапраўднае быццё - базеіп) і падначальваецца нечаму, што навязвае яму свой пункт погляду. Час для чалавека спыніўся і не мае ніякай каштоўнасці. Наперадзе адна мэта - дасягнуць свабоды. Дзякуючы нечалавечым намаганням, герой вырываецца з путаў палону, пераадольвае сцяну, трапляе па той бок Быцця. Але простаму смяротнаму пераадолець законы Сусвету не дадзена, і ў заканамерным выніку яго чакае трагічны фінал. Там, у мінулым «сваім» свеце, была дысгармонія і адзінота; тут, у новым царстве, - абсурд і тупік. Замкнёнае жыццёвае кола...

Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што аўтарская пазіцыя праяўляецца ў наступным:

- *абсурднасць дзяржаўнага ладу* (катэгорыя гістарычная і рэальная, алагічная паводле сваёй будовы);
- *адзінота* (галоўны герой замкнёны ў прасторы і ў часе, адарваны ад знешняга свету);
- *натоўп* (тая ўлада і яе прадстаўнікі, дзякуючы намаганням якіх герой аказваецца Ізаляваным);
- *бунт* (заканамерная рэакцыя чалавека на несвабоду, імкненне вырвацца на волю);
- *самасць* (пастаянна наяўная аснова клопату, а самастойнасць *Я* азначае папярэднюю рашучасць; гэтае апошняе і ёсць быццё, накіраванае да смерці - герой доўгі час імкнецца на свабоду, рашуча прыкладвае намаганні, а ў выніку атрымлівае трагічны фінал);
- *час і прастора* (аўтар выкарыстоўвае храналагічныя рамкі: мінулае - сучаснасць - будучае, а сцяна як перашкода з’яўляецца ключавым матывам твора);
- *фінал* (трагічнасць развязкі, заканамерная для нашага паўсядзённага жыцця).

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што «Сцяна» - твор, цалкам прасякнуты экзістэнцыяльнымі матывамі, навеянымі рэаліямі нялегкага гістарычнага часу, у якім нам давялося існаваць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Камю А. Бунтующий человек. - М., 1990.
2. Быкаў В. Сцяна. - Мн., 1995.